НЕКАТОРЫЯ

# ГЕНДЭРНЫЯ ПАНЯЦЦІ

І ТЭРМІНЫ

polska pomoc

## Гендэр

*гендер, gender*

Сацыяльна абумоўленыя ролі і адносіны паміж жанчынамі і мужчынамі (азначэнні «жанчыны», «мужчыны», «жанчыны і мужчыны» ўключаюць у сябе ўсе ўзроставыя катэгорыі адпаведных полаў і распаўсюджваюцца таксама на хлопчыкаў, дзяўчынак, юнакоў, дзяўчат, пажылых жанчын і мужчын). Яны выяўляюцца з дапамогай аналізу і могуць быць неаднольковымі ў розных грамадствах і культурах. Згаданыя ролі і адносіны могуць змяняцца з цягам часу.

Сацыяльны пол (gender) адрозніваецца ад прыроднага (sex). Апошні адлюстроўвае біялагічныя непадабенствы паміж жанчынай і мужчынам ды мае ўсеагульны і незменлівы характар.

## Гендэрная роўнасць

*гендерное равенство, gender equality*

Роўныя правы, абавязкі і магчымасці жанчын і мужчын усіх узростаў. Сюды ўключаюцца аднолькавыя правы чалавека, роўнае размеркаванне абавязкаў, магчымасцяў, працоўнай нагрузкі, прыняцця рашэнняў і прыбытку.

## Гендэрнае раўнапраўе

*гендерное равноправие, gender equity*

Гэта сродак дасягнення гендэрнай роўнасці. Гендэрнае раўнапраўе ўключае меры, накіраваныя на ліквідацыю гістарычных і сацыяльных умоў і фактараў, якія не дазваляюць жанчынам і мужчынам «гуляць» па адных правілах. Так, мэтанакіраваная падрыхтоўка прадпрымальніц у спалучэнні з гендэрна адчувальнымі ўмовамі крэдытавання з'яўляецца праявай гендэрнага раўнапраўя ў мэтах забеспячэння роўнасці ў доступе да рэсурсаў. Рэалізацыя праграм пазітыўных дзеянняў для выпраўлення гендэрнага балансу ў дзяржаўных органах або ў прыватным сектары спрыяе ўмацаванню гендэрнага раўнапраўя і працуе на дасягненне канчатковай мэты — гендэрнай роўнасці.

## Гендэрная дыскрымінацыя

*гендерная дискриминация, gender discrimination*

Любое адрозненне, выключэнне або перавага, што заснавана на прыкмеце полу або на прынятых у грамадстве гендэрных каштоўнасцях, стэрэатыпах і нормах ды адмоўна ўздзейнічае на роўнасць магчымасцяў і адносін. Дыскрымінацыя па прыкмеце полу можа таксама паўстаць, калі гендэрна нейтральныя палітыка і практыка аказваюць непамерна вялікі негатыўны ўплыў на найбольш неабароненую групу насельніцтва (часцей за ўсё, жанчын).

## Прамая дыскрымінацыя

*прямая дискриминация, direct discrimination*

Узнікае ў выніку прамога прымянення законаў, нарматыўных дакументаў або практык. Яна выяўляецца ў відавочна розных адносінах да жанчын і мужчын (прыкладам могуць служыць законы, якія не дазваляюць жанчынам падпісваць якія-небудзь кантракты).

## Ускосная дыскрымінацыя

*косвенная дискриминация, indirect discrimination*

Азначае, што нормы і практыка, якія на першы погляд з'яўляюцца гендэрна нейтральнымі, у рэальнасці ўшчамляюць прадстаўнікоў аднаго полу (напрыклад, патрабаванні, якія не маюць дачынення да выканання дадзенай работы, але якія даюць зразумець, што патрабуецца жанчына/мужчына) і даюць перавагу прадстаўніку/прадстаўніцы аднаго з полаў.

## Гендэрная «слепата»

*гендерная «слепота», gender blind*

Вобразны выраз, які характарызуе навуковыя даследаванні, інфармацыйна-асветніцкія матэрыялы, праекты і праграмы, у якіх не вылучаюцца і не ўлічваюцца гендэрныя адрозненні, якія існуюць у той ці іншай сферы (напрыклад, рэпрадуктыўныя ролі жанчын і мужчын).

## Гендэрна нейтральныя

*гендерно нейтральные, gender neutral*

Законы, нарматыўныя акты, палітычныя праграмы/праекты, навуковыя даследаванні, інфармацыйныя/навучальныя матэрыялы выкарыстоўваюць абстрактныя або агульныя паняцці і катэгорыі (пры гэтым, як правіла, пасунутыя ў карысць мужчынскай пазіцыі). Часам гендэрна нейтральны стыль падачы інфармацыі выкарыстоўваецца наўмысна для супрацьпастаўлення з тэрміналогіяй сексізму (напрыклад, пазначэнне прафесій або заняткаў назвай мужчынскага роду або пастаяннае выкарыстанне займеннікаў мужчынскага роду).

## Гендэрныя ролі

*гендерные роли, gender roles*

У большасці грамадстваў жаночыя і мужчынскія ролі разведзены па прыкмеце полу. Напрыклад, хлопчыкі дапамагаюць сваім бацькам у працы па-за домам (сталярныя працы, рамонт аўтамабіля), а дзяўчынкі дапамагаюць маці па хаце. У некаторых грамадствах жаночыя і мужчынскія ролі становяцца ўзаемазаменнымі. Так, мужчыны пачынаюць удзельнічаць у выкананні хатняй працы, а жанчыны становяцца асноўнымі карміцелькамі сям'і. Тым не менш раздзяленне гендэрных роляў на мужчынскія і жаночыя выяўляецца асабліва відавочна ў падзеле працы.

## Гендэрныя стэрэатыпы

*гендерные стереотипы, gender stereotypes*

Уяўленні людзей адносна таго, што павінны рабіць жанчыны і мужчыны. Маўляў, жанчыны лепш спраўляюцца з хатняй працай, а мужчынам больш падыходзіць роля лідэра, кіраўніка.

## Гендэрныя нормы

*гендерные нормы, gender norms*

Уяўленні людзей аб тым, якімі павінны быць жанчыны і мужчыны на працягу ўсіх пакаленняў. Напрыклад, у многіх грамадствах лічыцца, што жанчына мусіць быць паслухмянай і сціплай, ёй можна быць слабой. Мужчыны, наадварот, павінны быць адважнымі і моцнымі, не павінны праяўляць слабасць.

## Гендэрны аўдыт

*гендерный аудит, gender audit*

Праводзіцца з тым, каб ацаніць у якой ступені, наколькі рэгулярна і эфектыўна ўлічваюцца інтарэсы жанчын і мужчын у практычнай дзейнасці арганізацыі, у дакументах і публікацыях, на ўзроўні кіравання і прыняцця рашэнняў, у кадравай палітыцы.

## Гендэрнае бюджэтаванне

*гендерное бюджетирование, gender budgeting*

Гэта прымяненне комплекснага гендэрнага падыходу да фармавання і выканання бюджэту. Азначае правядзенне гендэрнага аналізу бюджэтаў, улік гендэрнай перспектывы на ўсіх этапах бюджэтнага працэсу, а таксама перафармаванне даходнай і расходнай частак бюджэту з мэтай забеспячэння прасоўвання гендэрнай роўнасці. Акрамя таго, гендэрна арыентаванае фарміраванне бюджэту заключаецца ў разглядзе меркаваных вынікаў бюджэтных асігнаванняў (іншымі словамі, у магчымасці ўбачыць, як бюджэтныя асігнаванні адаб'юцца на сацыяльна-эканамічных магчымасцях жанчын і мужчын).

## Дадзеныя з разбіўкай па полу

*данные с разбивкой по полу, gender disaggregated data*

Збор і выкарыстанне колькасных і якасных дадзеных асобна па жанчынам і мужчынам з мэтай правядзення гендэрнага аналізу палітыкі (напрыклад, праграм, даследаванняў, стратэгічнага планавання). Пры ўжыванні дадзеных з разбіўкай па полу выяўляюцца і высвятляюцца аспекты гендэрнай праблематыкі ў такіх галінах, як доступ да рэсурсаў і кантроль над імі, падзел працы, прыняцце рашэнняў, кадравая палітыка.

## Комплексны гендэрны падыход

*комплексный гендерный подход, gender mainstreaming*

Стратэгія, з дапамогай якой дасягаецца гендэрная роўнасць. Комплексны гендэрны падыход азначае ацэнку наступстваў для жанчын і мужчын любога планаванага дзеяння ў сферы заканадаўства, палітыкі або праграм у кожнай галіне і на ўсіх узроўнях. Гэта стратэгія інтэграцыі інтарэсаў жанчын і мужчын у працэс распрацоўкі, рэалізацыі, маніторынгу і ацэнкі ўсёй палітыкі ў палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сферах такім чынам, каб і жанчыны, і мужчыны ў роўнай ступені атрымлівалі ад гэтага карысць, а няроўнасць скарачалася.

# Маскуліннасць

*маскулинность, masculinity*

Сукупнасць сацыяльных уяўленняў, характарыстык паводзінаў, установак і чаканняў аб тым, чым з'яўляецца мужчына, якія якасці яму прыпісваюцца. Маскуліннасць таксама абазначае сукупнасць паводзенскіх і псіхічных рыс, уласцівасцяў і асаблівасцяў, аб'ектыўна ўласцівых мужчынам у адрозненне ад жанчын.

У цяперашні час праблемы маскуліннасці разглядаюцца таксама ў сувязі з неабходнасцю больш глыбокага і ўсебаковага ўсведамлення гендэрных роляў у грамадстве і аналізу мужчынскага «складніку» гендэрнай роўнасці. Гэта ўключае крытычны аналіз дамінуючых у грамадстве стэрэатыпаў, каштоўнасцяў і нормаў маскуліннасці, якімі кіруюцца ў сваіх паводзінах мужчыны, а таксама выяўленне і рашэнне праблем, з якімі сутыкаюцца мужчыны (нізкая працягласць жыцця, вытворчы траўматызм, вялікая схільнасць да такіх захворванняў, як алкагалізм, наркаманія, ВІЧ/СНІД, сухоты). Не варта таксама забываць аб неабходнасці развіцця і падтрымкі той станоўчай ролі, якую мужчыны адыгрываюць, удзельнічаючы ў вырашэнні пытанняў гендэрнай роўнасці.

# Практычныя гендэрныя запатрабаванні

*практические гендерные потребности, practical gender needs*

Патрэбы, вызначаныя жанчынамі мужчынамі ў межах іх сацыяльна абумоўленых роляў у грамадстве. Носяць практычны характар і, як правіла, закранаюць сітуацыі няроўнасці ў жыццёвых умовах, напрыклад, няроўны доступ да водазабеспячэння, медыцынскай дапамогі (у аддаленых рэгіёнах), працаўладкавання. Дзейнасць, накіраваная толькі на задавальненне практычных патрэбаў, не будзе мець устойлівых вынікаў да тых часоў, пакуль не будуць прынятыя да ўвагі таксама і стратэгічныя гендэрныя інтарэсы (гл. ніжэй).

# Пазітыўныя меры/дзеянні, ці пазітыўная дыскрымінацыя

*позитивные меры/действия, или позитивная дискриминация,*
*affirmative actions/measures, or positive discrimination*

Спецыяльныя часовыя меры (усякага роду льготы і перавагі), накіраваныя на ліквідацыю наступстваў мінулых фактаў дыскрымінацыі з мэтай дасягнення фактычнай роўнасці магчымасцяў і адносін у дачыненні да жанчын і мужчын. Прыняцце такіх захадаў, накіраваных на пэўную групу, звязана з тым, што заканадаўчая забарона якіх-небудзь дыскрымінацыйных нормаў не прывяла да адмовы ад іх на практыцы.

# Правы чалавека

*права человека, human rights*

У тэорыі правоў чалавека адрозніваюцца правы першага, другога і трэцяга пакалення. Да першага пакалення адносяцца натуральныя правы чалавека: права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі, права на вядзенне дзяржаўных спраў, права на роўнасць перад законам, права на жыццё, свабоду і бяспеку асобы.

Да другога пакалення адносяцца пазітыўныя (ці асноўныя) правы чалавека, якія замацаваны ў канстытуцыйных правах і свабодах (г. зн. заканадаўча рэгламентаваны) і забяспечаны сістэмай гарантый і механізмаў абароны. Асноўныя правы чалавека ахопліваюць асабістую, палітычную, сацыяльную, эканамічную і культурную сферы. Калі якое-небудзь асноўнае права не ўвайшло ў канстытуцыю дзяржавы, то яно павінна быць прызнана ў дадзенай краіне незалежна ад яго канстытуцыйнага замацавання. Такім чынам, у галіне правоў чалавека прызнаецца прыярытэт міжнароднага права ў адносінах да ўнутрыдзяржаўнага.

Калектыўныя правы — гэта трэцяе пакаленне правоў чалавека. Да іх адносяцца права на мір, на здаровае навакольнае асяроддзе, на сацыяльнае і эканамічнае развіццё. Гэтыя правы належаць кожнаму чалавеку, аднак яны ажыццяўляюцца не асобным чалавекам, а калектывам, агульнасцю, катэгорыяй грамадзян. Менавіта да такіх правоў адносіцца паняцце «правы жанчын».

## Прафесійная сегрэгацыя па прыкмеце полу

*профессиональная сегрегация по признаку пола, occupational segregation*

Выяўляецца ў дачыненні да жанчын і мужчын, якія прадстаўляюць пэўныя прафесіі і занятыя ў нейкіх галінах і якія займаюць пэўныя пасады.

## Гарызантальная сегрэгацыя

*горизонтальная сегрегация, horizontal segregation*

Выяўляецца ў нераўнамерным размеркаванні жанчын і мужчын па прафесіях і галінах эканомікі (галіновая сегрэгацыя). Такім чынам, занятасць можа быць ахарактарызаваная як «мужчынская» (у вытворчым сектары) або «жаночая» (сфера паслуг, адукацыя, ахова здароўя, гандаль).

## Вертыкальная сегрэгацыя

*вертикальная сегрегация, vertical segregation*

Выяўляецца ў нераўнамерным размеркаванні жанчын і мужчын па пазіцыях службовай іерархіі (напрыклад, жанчыны займаюць пасады, якія характарызуюцца больш нізкім статусам і патрабуюць больш нізкай кваліфікацыі).

## Роўныя адносіны ў сферы працы

*равное отношение в сфере труда, equal treatment in the world of work*

Праяўляюцца ў такіх пытаннях, як аплата і ўмовы працы, захаванне працоўнага месца і сацыяльнае забеспячэнне.

## Роўныя магчымасці ў сферы працы

*равные возможности в сфере труда, equal opportunities in the world of work*

Прадастаўленне роўных шанцаў на атрыманне пэўнага працоўнага месца або на працаўладкаванне, валоданне або кіраванне прадпрыемствам, на навучанне ці прафесійную падрыхтоўку, на дасягненне пэўнай кваліфікацыі і статусу, прафесійнага і кар'ернага росту, уключаючы тыя прафесіі і пасады, дзе існуе дамінаванне прадстаўнікоў аднаго полу.

## Пашырэнне магчымасцяў жанчын

*расширение возможностей женщин, empowerment of women*

Мэтанакіраваны працэс, заклікаты спрыяць, з аднаго боку, усведамленню жанчынамі існуючых праяў няроўнасці па прынцыпе полу, а з іншага боку, фармаванню іх актыўнай пазіцыі ў барацьбе з існуючым няроўным становішчам у сям'і, на працоўным месцы, у грамадскім жыцці. Гаворка ідзе аб магчымасцях жанчын самім кантраляваць сваё жыццё, г. зн. ставіць перад сабой пэўныя мэты і задачы, атрымліваць прафесійную падрыхтоўку, развіваць пачуццё ўпэўненасці ва ўласных сілах, вырашаць праблемы і самасцвярджацца.

## Сексуальныя дамаганні

*сексуальные домогательства, sexual harassment*

Паводзіны сексуальнага характару, якія закранаюць годнасць жанчыны ці мужчыны. Носіць празмерны, агрэсіўны і абразлівы характар для аб'екта дамаганняў, асабліва калі непрыманне або прыманне такіх паводзін аказвае ўплыў на наступныя рашэнні, якія датычацца працаўладкавання або ўмоў працы аб'екта дамаганняў. Сексуальныя дамаганні на працы, дома ці ў іншых месцах становяцца насіллем на сексуальнай глебе, калі яны суправаджаюцца фізічным або псіхалагічным гвалтам ці пагрозамі.

## Спалучэнне службовых і сямейных абавязкаў (баланс «праца — сям'я»)

*сочетание служебных и семейных обязанностей (баланс «работа — семья»), work & family responsibilities, work & family balance)*

Ступень гендэрнай роўнасці, якая вызначае суадносіны паміж прыватным і прафесійным жыццём чалавека.

## «Шкляная столь»

*«стеклянный потолок», glass ceiling*

Вобразны выраз, які азначае нябачны штучны бар'ер, які фарміруецца забабонамі светапогляднага і арганізацыйнага характару і зачыняе жанчынам шлях да кіруючых пасад у сферы кіравання ці да кар'ернага прасоўвання.

## Стратэгічныя гендэрныя інтарэсы

*стратегические гендерные интересы, strategic gender needs*

Адносяцца да адпаведнага статусу жанчын і мужчын у грамадстве. Стратэгічныя гендэрныя інтарэсы залежаць ад канкрэтных сацыяльна-эканамічных і палітычных ўмоў і звязаныя з гендэрным падзелам працы, доступам да рэсурсаў і ўлады. Стратэгічныя інтарэсы могуць ўключаць заканадаўча замацаваныя правы, роўную заработную плату, больш шырокі ўдзел у працэсе прыняцця рашэнняў, абарону ад хатняга гвалту і розных формаў сексуальнай эксплуатацыі. Улік стратэгічных гендэрных патрэбаў дапамагае жанчынам задавальняць свае практычныя патрэбы, самім кантраляваць сваё асабістае жыццё і грамадскую дзейнасць, і, такім чынам, змяняць існуючыя гендэрныя ролі.

polska pomoc

Гэтая выданне фінансуецца Міністэрствам замежных справаў Рэспублікі Польшча ў межах праграмы “Polska Pomoc”.

У брашуры выказаны меркаванні выдаўца, якія не маюць ніякага дачынення да афіцыйнай пазіцыі польскага МЗС.

*Адукацыйна-інфармацыйнае выданне*

НЕКАТОРЫЯ
ГЕНДЭРНЫЯ ПАНЯЦЦІ
І ТЭРМІНЫ

Рэдактар *Юрый Сцяпанаў*
Карэктар *Надзея Сцяпанава*

Гарнітура PetersburgC.
Наклад 50 асобнікаў

*Выдавец* міжнародная гендэрная праграма «Крок да роўнасці»
*http://schoolgender.do.am/*
*http://gender.do.am/*